Пытаўся пра Віталя Губарэвіча пры жыцці ў Міколы Канаша і наш гісторык Міхась Чарняўскі. Спадар Канаш тады адказаў і яму. Адказ гэты быў апублікаваны ў кнізе „Саюз вызвалення Беларусі: 1946-1947" (Мінск, „Беларускі Рэзыстанс", 2005. С.59-60) : „З Віталём Губарэвічам мне давялося пазнаёміцца ў страшных умовах ГУЛАГу 45 гадоў таму ў пасёлку Інта Комі АССР на 1-і ОЛП-е. Нічым асабліва ён не адрозніваўся ад іншых зняволеных: той жа бушлат з нумарам на спіне, тая ж аблавушка з рознакаляровых кавалачкаў тканіны на галаве, засмуголеныя невядомага колеру штаны ды кароценькія абгарэлыя вайлакі на нагах. Невысокага росту, з хударлявым тварам, на якім тырчэў нос. Уражвалі хіба вялікія вочы бледна-шэрага колеру. Ён, як пасьля казаў мне, хварэў на сухоты. А родам быў з Дзятлаўскага раёна, што на Гарадзеншчыне. Пісаў вершы на беларускай і расейскай мовах.

На той час я ўжо быў знаёмы з Ларысай Геніюш, якая знаходзілася тамсама, толькі на 4-м ОЛП-е, жаночым. Аднаго разу я пару Віталёвых вершаў адаслаў Ларысе. І неўзабаве атрымаў адказ, што яны яшчэ далёка не дасканалыя, але нічога – няхай піша надалей, не варта адбіваць у яго ахвоту пісаць...

Наўпрост Віталь з Ларысай не ліставаўся, а час ад часу аддаваў мне свае лісты пераважна ў вершаванай форме, каб я адаслаў ёй. Але такая перапіска між імі працягвалася нядоўга. Узніклі непаразуменні ў думках, у поглядах, разважаннях. Віталь лічыў сябе выхадцам з беднай сялянскай сям'і, а Ларысу чамусьці далучаў да мяшчанаў і да тых, што стаялі „на версе". Вядома, не меў рацыі. Па натуры ён быў добры, ён у парыве злосці не ўмеў сябе стрымліваць. І ў дадатак яшчэ быў хворы.

У 1955 ці ў пачатку 1956 года – адным словам ляжаў снег і было зімна – на шахце № 2 забіла камбайнам нашага хлопца Міколу Граноўскага, ён быў з Шаркаўшчынскага раёна, што на Віцебшчыне. І мы, беларусы, вырашылі яго пахаваць па-Божаму. Быў гэта ўжо час „хрушчоўскай адлігі". Мікола Яцкевіч працаваў у інструменталцы шахты № 2 і дапамог цеслярам зрабіць труну й крыж. Слаўка Прыстаўка арганізаваў збор грошай, і купілі касцюм. Быў складзены й пададзены начальству лягера спіс зняволеных беларусаў з шахты № 2 (каля 20 чалавек), каб дазволілі выйсці з зоны на пахаванне. Дазвол быў дадзены. Быў там і Віталь Губарэвіч, які прачытаў над магілай свой верш „На смерць Міколы Граноўскага". А па нейкім часе яму з бетону зрабілі помнік, дзе на мармуровай дошцы выразалі надпіс. Тэкст цяпер ужо дакладна не памятаю, ведаю толькі, што ёсць словы „Не забудзем цябе, сябра". Пахаваны ён на могілках у лесе „Сангарадка" непадалёку ад „Пцічніка". Можа, тая мясціна захавалася яшчэ й сёння?..".

Арышт

Віталь Губарэвіч нарадзіўся 3 студзеня 1926 года ў вёсцы Навагельня Дятлаўскага раёна. Калі яму споўнілася два гады – памерла маці. Бацька Віталя спачатку працаваў псаломшчыкам у царкве, а потым, калі прыйшлі саветы, на чыгунцы. Але аднойчы ў іх дом завіталі людзі ў цывільным з наганамі, зрабілі ў хаце вобыск, ператрэслі ўсе кнігі, але нічога крымінальнага і падазронага не знайшлі. Тым не менш бацьку Віталя Губарэвіча Міхася Губарэвіча арыштавалі. Больш сын і ўсе родныя і блізкія яго людзі, а таксама вяскоўцы, ніколі Губарэвіча старэйшага не бачылі, нават нічога не змаглі даведацца пра яго далейшы лёс.

Калі пачалася вайна, Віталь працягваў вучобу ў вячэрняй школе, а таксама падпрацоўваў на чыгунцы, каб дапамагчы сям'і. Немцы неяк запрыкмецілі на чыгунцы юнака і хутка яго адправілі на працу ў Германію. Па іншай інфармацыі, Віталь быў арыштаваны ў Вільні, там ён знаходзіўся ў роднай сястры. Выйшаў на рынак і трапіў у аблаву, дзе яго і схапілі. У Германіі ён цяжка працаваў на адным з ваенных заводаў.

На Дзятлаўшчыну юнак вярнуўся вясной 1945 года. Адразу пачаў працаваць, а таксама працягваў вучобу ў вячэрняй школе. Тады зачытваўся творамі беларускай літаратурай, сам пісаў вершы, але нікому іх не паказваў. На радзіме шукаў аднадумцаў, сяброў, якія яго разумелі б, з якімі ён мог бы падзяліцца сваімі думкамі і планамі.

У 1946 годзе Віталь Губарэвіч становіцца сябрам Саюза вызвалення Беларусі (СВБ). Найперш упаўнаважаным СВБ на Дзятлаўшчыне. Супрацоўнікі НКУС яго часта затрымлівалі, выклікалі юнака на допыты, але стопрацэнтных доказаў знайсці не змаглі. І хоць Віталю было толькі 20 гадоў, за гэты час ён шмат бачыў і перажыў, меў пэўны жыццёвы вопыт. Але ўлады хацелі зламаць яго дух. Як жа так: бацька быў ворагам народа, сам Віталь падчас вайны знаходзіўся ў Германіі, а вярнуўшыся дамоў



Віталь Губарэвіч, Інта, 1954 г.

засёды размаўляў па-беларуску, пісаў вершы… За Віталем пастаянна сачылі. І неяк сярод сяброў СВБ знайшоўся здраднік, які іх выдаў НКУС. Сяброў арыштавалі: адных саслалі ў Сібір, іншых расстралялі. Не ўдалося толькі арыштаваць Губарэвіча. Але аднойчы такі момант здарыўся. У вячэрняй школе, дзе вучыўся Віталь, вісеў партрэт Сталіна. Неяк нехта выкалаў дыктатару вочы. Доўга шукалі вінаватага, пакуль нарэшце сын дырэктара школы не сказаў, што гэта зрабіў Губарэвіч, хаця ён да гэтай справы ніякага дачынення не меў. Хутка Віталя арыштавалі і далі яму 10 гадоў, адправіўшы ў Варкуту, а потым у Інту. Адбылося гэта ў траўні 1947 года.

У лагерах дзятлаўскаму хлопцу было невыносна цяжка, але дух юнака не зламалі. У яго пачаліся сухоты. Ад гэтай хваробы і ад цяжкай працы паміралі дзесяткі сяброў. Але Віталь трымаўся сваіх землякоў, якія разам дапамагалі адзін аднаму выжыць. Там ён пазнаёміўся з Ларысай Генію, перадаваў праз сяброў ёй свае вершы, спрачаўся, разважаў. Адзін з вершыў нават прысвяціў паэтцы. У ім ёсць і такія радкі:

…Ты гамаю акордаў мілагучных
Напоўніла мне сэрца да краёў,
І вобразаў так родных, неадлучных
Чарга перад вачыма ўстала зноў.
І я за ліру ўзяўся міма волі,
І грозна песня загула мая,
Яна пяе братам маім аб волі,
Аб нашых родных, дарагіх краях.
Але не плач у песні гэтай льецца –
Яна гучыць, як атамана кліч,
Пракляццем грозным
з сэрца майго рвецца,
Ўздымае помсты ўсенародны біч.

Вяртанне

На родную Бацькаўшчыну Віталь Губарэвіч вярнуўся ў 1956 годзе, тады яму было толькі 30 гадоў. У Наваельні на Дзятлаўшчыне ён здаў экзамен за курс сярэдняй школы і паступіў на фармацэўтычны факультэт Ленінградскага хіміка-фармацэўтычнага інстытута, які скончыў, атрымаўшы спецыяльнасць правізара-фармацэўта. Працаваў у аптэках вёскі Наваельня, у Навагрудку, а потым яго прызначылі на працу ў вёску Дварэц аптэкарам.

Вёсцы пашанцавала. Бо, акрамя сваёй працы, Віталь вёў актыўнае грамадскае жыццё. Ён іграў у Наваельнянскім духавым аркестры, арганізаваў тэатральны гурток у мясцовым клубе ў Дварцы. Вясковыя артысты часта паказвалі пастаноўкі па творах беларускіх драматургаў. Сам Віталь выдатна іграў камедыйныя ролі, пісаў розныя вершаваныя гумарэскі на тэмы вясковага жыцця і выконваў іх на сцэне. У вольны час ён спрабаваў пісаць вершы, займаўся перакладамі гумарэсак з польскага часопіса „Шпількі”, які выпісваў. Збіраў і запісваў у вёсках Дзятлаўшчыны легенды і паданні.

Але страчанае здароўе ў Германіі і 9 гадоў лагераў рана забралі ў яго жыццё. Віталя Губарэвіча не стала ў 1976 годзе. Яго пахавалі на могілках у вёсцы Дварэц Дзятлаўскага раёна, дзе да сённяшніх дзён стаіць там сціплы помнічак.

З успамінаў Міколы Грышана

У пошуках звестак пра Віталя Губарэвіча, напрыканцы 2013 года сустрэўся з дзятлаўскім 82-гадовым паэтам, настаўнікам-пенсіянерам Мікола Грышанам, які некалі шукаў сляды Віталя Губарэвіча. Мы доўга пра яго і пра той час гутарылі.

– Спадар Мікола, калі Вы займаліся пошукамі звестак пра Віталя Губарэвіча?



Хата ў вёсцы Наваельня Дзятлаўскага раёна, дзе жыў Віталь Губарэвіч

– Гэта было ў пачатку 1990-х гадоў. Я тады наведаў вёску Дварэц, бачыўся з яго другой жонкай. Калі Віталь Губарэвіч працаваў у Германіі, яму адарвала ўказальны палец на правай руцэ. Яго арыштавалі за ўдзел у Саюзе вызвалення Беларусі. Штаб арганізацыі знаходзіўся ў Навагрудку. Раскрыў арганізацыю правакатар, падасланы да іх. У раённай газеце Віталь Губарэвіч сваіх вершаў не друкаваў, відаць, яго вершы былі не для друку. У тых 1990-х гадах я напісаў і прысвяціў яму свой верш, праўда, ён нідзе не публікаваўся. Верш гучыць так:

На свеце жыў юнак-паэт,
Ад мерзлаты прыдбаў сухоты.
Не змог ускалыхнуць ён свет,
Ён плавіўся, гарэў употай.
Ды толькі душу груганы
Не змаглі вырваць кіпцюрамі,
Не ведалі тады яны,
Што ў цьме зырчыць яна агнямі.
Ён быў зраднёны са скалой,
Дзе б'юцца ў громах вадаспады.
Таму фальшывасці сляпой
Яго дух быў непадуладны.

– А ці пыталася ў Віталя жонка за што ён быў арыштаваны?

– І я такое пытанне таксама задаваў жонцы Губарэвіча. Яна пыталася ў яго, але Віталь казаў, што на допытах яго абвінавачвалі ў тым, што падчас вайны ён дапамагаў немцам у Германіі, калі быў прымусова туды вывезены. Пра Саюз вызвалення Беларусі ён нікому нічога васля вяртання з лагераў не казаў.

У Губарэвіча тады быў пасынак – Міша Кузьміцкі. Некалі ён працаваў педагогам, быў даволі адукаваным чалавекам. Меў вышэйшую адукацыю. Пісаў вершы, друкаваўся. Але ў 1990-х гадах ён ужо не пісаў нічога, правацаваў вартаўніком, бо з'ела беднага гарэлка. А цяпер у жывых іх наогул нікога ўжо няма. Людзі казалі мне тады, што вершы Кузьміцкі пісаў не сам, а гэта былі вершы Губарэвіча, якія Міша прыпісваў сабе. Але я ў гэта мала веру, бо друкаваўся Кузьміцкі ў 1960-х гадах, калі жыў Губарэвіч, а на такое Кузьміцкі не змог бы пайсці. Ды стыль вершаў Кузьміцкага непадобны на стыль вершаў Губарэвіча.

– А ці вядома Вам, што за правакатар выдаў Саюз вызвалення Беларусі і, у прыватнасці, Віталя Губарэвіча?

– Калі ў вячэрняй школе ў Наваельні вучыўся Віталь Губарэвіч, інструктарам Дзятлаўскага райкама



Віталь Губарэвіч (пасярэдзіне) з сябрамі каля аптэкі ў вёсцы Дварэц Дзятлаўскага раёна, 1965 г.



Помік на магіле Віталя Губарэвіча ў вёсцы Дварэц Дзятлаўскага раёна

камсамола быў Алесь Бажко. Яны былі добра знаёмыя. Вось ён і аказаўся тым правакатарам. Справа ў тым, што пра яго, як пра стукача, мне распавядаў неяк былы выкладчык Гродзенскага пединстытута Браніслаў Ржэўскі (1905-1980). КДБ падаслала Бажко да Ржэўскага, калі той аднойчы быў выкліканы ў Мінск, нібы для ўдакладнення праграмы па беларускай літаратуры. Тры дні ўвіхаўся каля Ржэўскага тады Бажко, а потым змест іх размоў быў прыгаданы на допытах Ржэўскага, якія праводзілі супрацоўнікі КДБ у 1957 годзе. 25 сакавіка 1957 года Ржэўскага Браніслава асудзілі Гродзенскім абласным судом па артыкуле 72 КК БССР да 7 гадоў пазбаўлення волі. Так што і ўсім сябрам Саюза вызвалення Беларусі, у тым ліку і Віталю Губарэвічу, дасталося ад Бажко.

Замест пастскрыптума

Вось такім быў кароткі лёс дзятлаўскага змагара Віталя Губарэвіча – беларускага патрыёта, творчага чалавека, фармацэўта. Яго жыццёвы шлях яшчэ трэба даследаваць, таму што пра такіх беларусаў мы павінны ведаць і не забываць ніколі. І яшчэ. Хачу шчыра падзякаваць настаўніцам Дварэцкай сярэдняй школы Дзятлаўскага раёна Наталлі Ляўкевіч і Вікторыі Воўкавай, а таксама сябрам гісторыка-патрыятычнага клуба „Спадчына" гэтай школы за дапамогу ў зборы матэрыялаў пра Віталя Губарэвіча.

Сяргей Чыгрын

70 гадоў таму назад загінуў Францішак Аляхновіч

...Ды камень, як гару, узваліце мне на гроб...
(Ф. Аляхновіч, „Як я памру...”)



Францішак Аляхновіч (1921 год)

У палове лютага пазваніла мне ўнучка Францішка Аляхновіча, Мажэна, з пытаньнем наконт помніка дзеду на Віленскіх Росах. Ці нехта штосьці робіць, бо сям’я гатова дакласціся. Раней пытаўся пра тое ж самае унук драматурга, Андрэй. Помнік Францішку Аляхновічу хаця і стаіць ужо каля 20 гадоў, але выкананы ён з пластмасы, з якой час зрабіў сваё. Здаецца, зараз нікому не пад сілу, каб заняцца гэтай справай, хаця яшчэ жывуць людзі, якія памятаюць пахаваньне драматурга і галоўнага рэдактара віленскай газэты „Беларускі голас”, якую выдаваў падчас нямецкай акупацыі.

Рэня, Аля, Міраслава...

На здымку з паховінаў Францішка Аляхновіча, які я некалі атрымала ад інжынера Рэгіны Окруй, дзьве дзяўчынкі трымаюць бел-чырвона-белыя стужкі ад вянка, які нясе нейкі мужчына. Рэня вучылася ў Віленскай беларускай гімназіі падчас нямецкай акупацыі і запамятала пахаваньне „нейкага беларускага дастойніка” – не памятала, каго хавалі. Кім была дзяўчынка з другога боку, яна не памятала. Аднойчы я вырашыла пазнаёміць яе з іншай быўшай гімназісткай – Аліцыяй Фіялкоўскай (з дому Куніцкай). 20 красавіка 2004 г. мы сустрэліся ў Рэгіны Окруй. Разглядаючы здымкі, Аля распазнала сябе з другога боку вянка. Аказалася, што абедзьве дзяўчынкі ішлі ў адной пары. Успомнілі адзін факт: няведама чаму было загадана ім час ад часу – на адпаведні загад – падвіваць ніжні белы кавалак стужкі, каб выглядала яна як бел-чырвоная. Падазравалі яны, што прычынай магла быць небяспека перад польскім падпольлем.

Жанчыны не прыпомнілі сабе, каб вучыліся ў адным і тым самым класе. Але ж нехта іх паставіў у пару пры вянку, каб несьці стужкі. Аля (1933 год нараджэньня) была дачкой доктара Тэадора Куніцкага, які падчас навукі ў Віленскім унівэрсытэце быў адным з заснавальнікаў і дзеячам Беларускага студэнцкага саюзу, а ў час вайны жыў у Вільні (пры Віленскай вуліцы) і працаваў лекарам. Успамінала канцэрт Міхася Забэйды-Суміцкага ў Вільні і яго побыт у іхняй кватэры, дзе затрымаўся падчас пабыўкі ў Вільні. Сярод дзіцячых успамінаў таго часу астаўся ў яе памяці вобраз сьпевака, які піў сырыя яйкі, дзеля лепшага голасу.

Хаця Аля не памятала Рэні са школы, але памятала Міраславу Станкевічанку, з якой усё жыцьцё сям’я Куніцкіх (асабліва Тодзік і Аля) падтрымлівала сувязі. Міраслава (1933 г. нараджэньня – па мужу Русак) расказвала пра паховіны Францішка Аляхновіча 10 гадоў таму удзельнікам канферэнцыі „Драматычны шлях драматурга”. Дачка Станіслава Станкевіча – славутага кнігара, памятала, што ўсёй школай былі на паховінах Францішка Аляхновіча. Яшчэ зараз расказала, як вестка пра яго забойства ўскалыхнула ўсіх віленскіх беларусаў, як у яе хаце гаварылі пра тое бацькі. Мела багата здымкаў з паховінаў, але ў пачатку 90-ых гадоў нехта з Польшчы пазычыў іх і не вярнуў. Не запісала, каму іх давала – так яны і прапалі. Гэта была агромністая працэсія, хавалі Францішка Аляхновіча ўсе беларусы, на вуліцах таксама стаяла шмат людзей.

Рэня (1932 год нараджэнньня, з дому Точка) паходзіла з сям’і Грынкевічаў з Новага Двара. Яе маці была дваюраднай сястрой старэйшага Станіслава Грынкевіча і роднай – малодшага. Таму са сваім мужам і дзецьмі яшчэ да вайны – у 1937 г. – паехала ў Ерузалімку пад Вільняй, каб займацца там гаспадаркай Станіслава Грынкевіча. Пазьней жылі і працавалі ў Баляслава Грабіньскага. Бацька Рэні быў возьным у Віленскай беларускай гімназіі. У 1944 г. быў арыштаваны НКВД. Уцёк з транспарту і нелегальна перайшоў

мяжу ў Польшу, дзе ўжо была жонка з дзецьмі. Пасяліліся ў Гданьску. Рэня спатыкала на вуліцах розных вучняў з Віленскай беларускай гімназіі, але не разумела, чаму яны бачачы яе адварочваліся ў другі бок, не хацелі кантактавацца з ёю. Зараз яна ведае, што праз іх прамаўляў страх. Эпізод навукі ў беларускай школе пад нямецкай акупацыяй хацелі яны як найхутчэй забыць, каб бяспечна жыць у Польшчы.

Юры, Казімір, Альгерд...

3 красавіка 2005 г. Рэня з Аляй сустрэліся яшчэ раз пры нагодзе сьвяткаваньня ўгодкаў БНР у Гданьску, якія прысьвечаныя былі Францішку Аляхновічу. Прысутнічалі таксама яго сыны – Юрка і Казімір, унук Яцак з жонкай Ганаратай і іх пляменьнік праф. Альгерд Наркевіч – сын доктара Адольфа Наркевіча, якога цётка Марыя была маці Францішка Аляхновіча. Мелі яны магчымасць пазнаёміцца з прысутнымі на пахаваньні даўнімі дзяўчынкамі. У 2004 г. Юры і Казімір Аляхновічы пазнаёміліся ў Вільні з Міраславай Русак. Ім як сынам не дадзена было прысутнічаць у пахаваньні бацькі – першы быў у турме ў Францыі, другі – у лесе пад Вільняй, хаця пра сьмерць бацькі даведаліся ад маці. Захавалі даволі шмат сямейных здымкаў з дзяцінства. Праф. Альгерд Наркевіч прынёс здымак, які вісеў у яго кабінэце на сьцяне. На ім першы злева – Францішак Аляхновіч, другі справа – Адольф Наркевіч, першы злева стаіць – Антон Ілініч, першы справа сядзіць праўдападобна Астахевіч. Апошнія невядомыя... Здымак напэўна быў зроблены перад І сусьветнай вайной.

На працягу апошніх шасьці гадоў не стала сыноў Францішка Аляхновіча – Юркі ў 2008 г., Казіміра і іхняга пляменьніка праф. Альгерда Наркевіча – у 2010 г. 30 красавіка 2013 г. адышла ў лепшы свет лекар стаматолаг Аліцыя Фіялкоўская. Пасля сустрэчы ў Вільні Таццяна Дубавец зрабіла фільм з пабыўкі там сям'і Аляхновічаў. На жаль, яна таксама нечакана адышла ў канцы 2010 г. у лепшы свет, але пасьпела запісаць для нашчадкаў вяртаньне Аляхновічаў на бацькаўшчыну пасьля доўгага там небыцьця. Праўнучкі Францішка Аляхновіча – Эмілія і Ганна таксама ўпершыню мелі нагоду пахадзіць сьлядамі свайго дзеда і прадзеда. Варта згадаць і праф. Анатоля Сабалеўскага, памерлага вясной 2012 г., дасьледчыка жыцьця і дзейнасьці Францішка Аляхновіча, які ў 2004 г. прыехаў у Вільню з Менска пазнаёміцца з раднёй свайго героя. У 2005 г. у Менску з яго прадмовай і ўкладаньнем з'явіліся „Выбраныя творы" Францішка Аляхновіча – першы зборнік яго творчасьці за такі доўгі час. 10 асобнікаў зборніка заказаў Юры Аляхновіч для сваіх нашчадкаў – дочкам Мажэне і Аляксандры, унучкам – Эміліі і Ганне, і братанкам – Андрэю і Яцку, ды іхнім дзецям: Касі, Тамашу і Пятру. Яны фактычна толькі ў пачатку XXI стагоддзя даведаліся пра свайго слаўнага дзеда і прадзеда – такі быў у сям'і страх перад расказваньнем пра свайго бацьку. Трэба было на гады пра яго забыць. У 2004 г., калі я ў Гданьску адшукала сына Францішка Аляхновіча, ён сказаў: „толькі зараз я магу прызнацца да свайго бацькі. Калі б вы знайшлі мяне 10 гадоў таму назад, я б адмовіўся ад свайго бацькі". Калі Мажэне Аляхновіч трапіла ў рукі выдадзеная ў 1990 г. у Польшчы кніга дзеда „W szponach GPU", запытала бацькі, ці аўтар мае нешта супольнае з ёю, дык той адмовіўся ад бацькі, гаворачы, што гэта толькі супадзеньне прозьвішчаў. Пасьля вяртаньня са ссылкі ў Савецкім Саюзе яго выкінулі з ПАРП толькі за тое, што дашукаліся, што ён сын „беларускага нацыяналіста". А гэта ў далёкія часы (50-60-ыя) ПНР не дазваляла рабіць кар'еры ў яго прафесіі інжынера-будаўніка.

Добра, што пасьпелі мы пахадзіць па Вільні сьлядамі Аляхновічаў. 60-ыя ўгодкі сьмерці беларускага драматурга арганізавалі Людвіка і Сяргей Вітушкі. Апошні таксама ўжо братаецца з Францішкам Аляхновічам на тым сьвеце ад ліпеня 2012 г.

Невядомыя сьляды

3 сакавіка 1944 г. Францішка Аляхновіча забілі (невядомы ці невядомыя) у яго кватэры пры вуліцы Партовай у Вільні. Сьведкам была яго жонка. Але кім яна была? Паводле аповедаў Юркі Аляхнові-



Фота са збораў Рэгіны Окруй

Пахаванне Францішка Аляхновіча ў Вільні, сакавік 1943 г. Злева Аліцыя Куніцкая, справа Рэгіна Точко

ча, яна была намнога маладзейшая за яго. Беларуска. Бацька жаніўся на ёй пасьля вяртаньня з Салавок, калі ранейшае сямейнае жыцьцё не склеілася. Што з ею здарылася пасьля вайны? Яна магла б шмат што сказаць... але, відаць, таксама баялася выяўляцца, як жонка беларускага нацыяналіста. Магчыма, што і яе сустрэў незайздросны лёс. Мне стала вядома толькі пару гадоў таму назад, што папярэдняя жонка Станіслава (з Аколаў-Зубкоўскіх), памерла ў 1958 г. і пахавана на могілках у Гдыні-Арлове. Сынам, як і ёй, пасьля вайны прыйшлося жыць ціха на Памор'і.

У жыцьці Францішка Аляхновіча, які павінен быў стаць класікам беларускай драмы, не шанцавала. Віной быў яго беларускі выбар. Праўдападобна як польскі акцёр, а магчыма і драматург, упісаўся б у гісторыю польскага тэатру больш значна, чым беларускага. Яго біяграма дзякуючы трохгадовай дзейнасьці ў польскіх тэатрах (1907-1910) трапіла ў „Słownik bibliograficzny teatru polskiego 1900-1988" (t. II, Warszawa 1994, s. 504). Даволі багата звестак з яго дзейнасьці на працягу трох гадоў. У 1907 г. стараўся атрымаць згоду на прадстаўленьні ў Менску, Каўнасе, Слоніме і Беластоку. Невядома, ці яе атрымаў. Са сьнежня 1907 г. выступаў у Варшаве ў трупе Ф. Квасьнеўскага ў тэатры пры вуліцы Макатоўскай. У лютым 1908 г. быў заангажаваны у аб'язную трупу К. Каміньскага, у якой быў да канца траўня. Пасьля вярнуўся ў Варшаву і выступаў у тэатры „Багатэля" пад кіраўніцтвам Прухнеўскага. З 1909 г. іграў у Любліне, м.інш. у „Białych pawiach" і „Panu Damazym". У тэатральны сезон 1909-1910 яго заангажавалі ў люблінскую трупу Мышкоўскага. З 12 лютага 1910 г. з украінскай п'есы „Па рэвізіі" М. Крапіўніцкага (мабыць прывезенай ім з Любліна) пачалася яго прыгода з беларускім тэатрам – спярша ў Вільні, а пасьля ў Менску. Праўда, зараз і ў Беларусі, пачынаючы з 90-ых гадоў, стаў ён энцыклапедычнай постацю, а яго драмы і камедыі можна пабачыць у беларускіх тэатрах. Але ўсё нечага не хапае, каб Францішак Аляхновіч заіснаваў як агульнанацыянальны драматург, акцёр і гісторык тэатру. Праўда, прысуджваецца зараз нават прэмія яго імя. Але належнага ўшанаваньня так ён і не дачакаўся. Няма ні нармальнага помніка, ні напісанай біяграфіі, у якой шмат белых плямаў, яго імем не называюцца вуліцы ды тэатральна-мастацкія ўстановы. Нават невядомы да канца абставіны яго сьмерці, як і невядомы яго забойцы. Наўрад ці праводзілася нейкае расьследаваньне вясной 1944 г. Месца спачынку Францішка Аляхновіча на эвангеліцкіх могілках у Вільні было знішчана разам з імі ў 1989 г. Добра, што знайшліся рупныя беларусы, якія сімвалічна перанесьлі яго магілу на Росы – на „літаратурную горку". Відаць, на той час ніхто не ведаў, што на Росах пахавана яго маці Марыя з Наркевічаў Клімава, якая памерла 6 кастрычніка 1938 г., маючы 75 гадоў. Пра пахаваньне яе ў „Kuriery Wileńskim" паведамлялі муж і сын Францішак. Здаецца, ні ў адной беларускай газэце – хаця іх тады выдавалася ўжо мала – не было спачуваньняў выдатнаму беларускаму драматургу. Сапраўды, вярнуўшыся з Салавок, больш прыхільнасьці прыдбаў ён сабе сярод палякаў, чым сярод беларусаў. Як пісаў Чэслаў Мілаш, на яго побыт на Салаўках шмат хто глядзеў пада-зрона – значыць, калі там быў, дык у чымсьці правініўся... І, здаецца, не здолеў апраўдацца да канца, апісваючы „праўду пра саветаў", хаця і перакладзеную на розныя мовы сьвету. Мабыць на перашкодзе яго славе стала II сусьветная вайна са сваёй разбуральнай сістэмай. А магіла яго маці так і не знойдзена да сёньня.

У 1943 г. у Вільні Францішак Аляхновіч сьвяткаваў сваё 60-годзьдзе. Не спадзяваўся ўжо нічога асаблівага ад лёсу, які ўсё жыцьцё над ім здзекваўся „без пардону". У ім запісана не толькі асабістае трагічнае жыцьцё, але і трагічны лёс нацыі ды сям'і.

Лена Глагоўская ■

Успаміны з 1988 г.

3. Агра ляжыць на поўнач ад Дэлі ў штаце Утар-Прадэш. З 1528 г. да 1658 г. Агра была сталіцай імперы Вялікіх Маголаў. Цяпер жыве ў ёй больш чым міл. жыхароў і з'яўляецца турыстычным горадам з-за маўзалея Тадж-Махал, які называюць цудам свету. Агра паўстала ў XV стагоддзі. У 1526 г. захапіў яе Бабурі, збудаваў у ёй умацаванні і стала яна сталіцай імперыі. На правым берагу Джамны збудавалі крэпасць. Аднак у 1658 г. Аурангзеб перанёс сталіцу ў Аурангабад. А ў XVIII стагоддзі на Агру нападалі і яе разбуралі джаты, персы і афганцы. У 1784 г. яе вельмі разбурылі маратхі. У 1803 г. захапілі горад ангельцы, якія выгналі маратхаў. І хутка Агра стала гандлёвым горадам. Між Аграй, Дэлі, Бенарэсам і Калькутай збудавалі яны чыгунку. У 1857 г. у Агры было паўстанне. Ангельцы схаваліся ў крэпасці пакуль не прыйшла армія з Англіі, якая разграміла паўстанцаў.

Калі мы прыехалі ў Агру, то паказалі нам напачатку Тадж-Махал. Збудаваў яго Шахджахан для сваёй жонкі Мумтал Махал, якая памерла ў 1631 г., калі радзіла 14-е дзіцё, а Шахджахан быў на вайне. Будавалі яго 22 гады 20 тыс працаўнікоў. Уваход вядзе праз вялікую Са-

рацынскую браму, зробленую з чырвонага пясчаніка. Высціланая мармурам дарога вядзе да шырокага канала праз 4 агароды да маўзалея. Сімвалічная грабніца жонкі шаха стаіць на платформе вышынёй 75 м., над якой вісіць вялікі цэнтральны купал падобны да цыбулі. Галоўны купал акружаюць малыя бочныя купалы. Вакол маўзалея стаяць 4 круглыя мінарэты. Праўдзівая грабніца знаходзіцца ў падзямеллі.

Перад маўзалеем дзяўчына, з каторай я сядзеў у аўтобусе, зрабіла мне здымак маім фатаапаратам. Пасля мы абышлі ўвесь маўзалей. Увайшлі таксама ў падзямелле.

Пасля аўтобус завёз нас у Чырвоны Форт, які збудаваны быў у паўночна-ўсходняй частцы Агры. Двайныя тоўстыя муры вышынёй больш чым 20 м., зробленыя з чырвонага пясчаніка акружаюць крэпасць. Муры мелі даўжыню 2,5 км. Навокал муру калісь цягнуўся глыбокі і шырокі роў напоўнены вадою. Уваходзіцца ў Чырвоны форт праз цікавую браму. Да ўнутранага форту трэба прайсці праз другую браму, на якой стаіць высокая васьмібочная Язміновая Вежа пакрытая залатым купалам. Ля яе стаялі калісь будынкі імператара маголаў і яго чыноўнікаў, залы, дзе ён прымаў замежных дыпламатаў.

Абышлі мы форт, пабачылі грабніцу перскага мірзы і вяртаючыся ў Дэлі затрымліваліся пры нейкіх цікавых храмах і мусульманскіх мячэцях і з'елі абед. Вярнуліся вечарам на вячэру.

10 і11 верасня хадзіў я па базарах, дзе купіў жонцы куртку з норак і іншыя сувеніры для сям'і і вечарам 11 верасня паехаў з іншымі працаўнікамі на аэрадром. Самалёт у Варшаву цяпер не ляцеў праз Дубай, як раней. Прызямліліся мы ноччу ў Ташкенце, выйшлі з самалёта ў залу на аэрадроме, прасядзелі там мінут 40, вярнуліся зноў у самалёт і другі раз ранкам прыселі на аэрадроме ў Бургасе ў Балгарыі. Там былі бязмытныя магазіны, дзе я купіў балгарскую пліску. Перад абедам прыляцелі мы ў Варшаву, дзе чакала мяне жонка. І так вярнуўся я дамоў.

Дома ў мяне ляжала запрашэнне прыехаць у Беласток, дзе ўручылі мне Адзнаку заслужанага дзеяча культуры і 17 верасня я з жонкаю і двума ўнукамі з Беластока паехаў на два тыдні ў Дом адпачынку „Энергапраекта" ў Свінавусці, у які мая жонка выкупіла раней у маім месцы працы пакоі. Мелі мы там два аддзельныя пакоі, кожны з ванным пакоем. У адным быў я з унукам Лукой, у другім жонка з Грыгорыем. Пагода была сонечная і ўнукі купаліся ў моры. У кастрычніку я зноў быў у Варшаве і атрымаў двухмесячны водпуск з працы ў „Энернапраекце". Скіравалі мяне на медыцынскае абследаванне, ці я не маю нейкай трапічнай хваробы. Абследаванні ніякай трапічнай хваробы ў мяне не выкрылі. У кастрычніку прыехалі да мяне знаёмыя з Сарн з Украіны і прывезлі мне два каляровыя савецкія тэлевізары, якія я ў іх купіў і гэтыя тэлевізары працавалі ў мяне да 1992 г. Тады я іх аддаў знаёмым, бо купіў сабе заходнія тэлевізары.

У лістападзе пачаў я ізноў працаваць у „Энергапраекце". Пачаў праектаваць аўтаматыку ачысткі дыму ад серы і іншых шкодных элементаў на электрастанцыі Белхатуў і часта туды ездзіць аўтамашынай „Энергапраекта". „Орбіс" выслаў мяне на бясплатны курс замежных экскурсій, бо я меў амаль трохгадавы перапынак у працы з турыстамі. Зімою хадзіў я на курс і толькі ў чэрвені 1989 г. я атрымаў замежную экскерсію ў Ташкент , а потым на Украіну у Днепрапятроўск і на Беларусь у Гомель.

Ад 17 верасня да 2 кастрычніка прайшлі ў Сеуле ў Паўднёвай Карэі XXIV Летнія Алімпійскія спаборніцтвы. Найбольш медалёў атрымаў СССР: 55 залатых, 37 срэбных і 46 бронзавых, другое месца заняла ГДР: 37 залатых, 35 срэбных і 30 бронзавых медалёў і 3-яе месца ЗША: 36 залатых, 31 срэбных і 27 бронзавых медалёў.

19 верасня Ізраіль запусціў у космас свой першы разведвальны спутнік.

25 верасня прэм'ер-міністрам урада Польшчы стаў замест Збігнева Меснера Мечыслаў Ракоўскі і 14 кастрычніка стварыў новы ўрад.

29 верасня у ЗША наступіў 26 старт (STS-26) па праграме Спейс Шатл, 7 –мы палёт шатла Дыскаверы з касманаўтамі Фрэдэрыкам Хаўкам, Рычардам Ковi, Джонам Лоунджам, Дэвідам Хілмерсам і Джорджам Нельсанам.

1 кастрычніка М. Гарбачоў стаў Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага савета СССР.

29 кастрычніка польскі ўрад аб'явіў, што суднаверф у Гданьску будуць ліквідаваць.

2 лістапада прыехала з візітам у Польшчу прэм'ерміністр Англіі Маргарэт Тэчэр на размовы з В. Ярузельскім, М. Ракоўскім, Ю. Глемпам і Л. Валэнсам.

2 лістапада ў катастрофе польскага самалёта Ан-24 пад Жэшавам згінула 1 асоба.

8 лістапада прэзідэнтам ЗША стаў кандыдат Рэспубліканскай партыі Джордж Буш (старэйшы).

15 лістапада выляцеў у космас у СССР касмічны карабель шматразовага выкарыстання „Буран" і ракета „Энергія".

21 лістапада прайшлі пагромы армян у Баку, Кіравабадзе, Нахічэване, Хандарэ, Шамхарэ, Шэке, Казахе, Мінгечаўрэ. На пачатку снежня пачалі выганяць армян з Азербайджанскай ССР і пачалася поўная дэпартацыя азербайджанцаў з Армянскай ССР.

26 лістапада СССР выпусціў у космас касмічны карабель „Саюз ТМ-7" з касманаўтамі А.А. Волкавым, які вярнуўся на зямлю 27 красавіка 1989 г., з С.В.Крыкалёвым і французскім касманаўтам Ж.Л.Крэт'енам. Прыстыкаваліся яны да касмічнай станцыі „Мір" і вярну-

ліся на зямлю 21 снежня 1988 г. на касмічным караблі „Саюз ТМ-6" В.Г. Цітаў, М.Х.Манараў і француз Ж.Л.Крэт'ен.

1 снежня ў Арджанікідзе ў Паўночнай Асеціі тэрарысты захапілі школьны аўтобус з 30 дзяцьмі і настаўнікамі і жадалі даць ім самалёт. 2 снежня атрымалі самалёт за заложнікаў, якім даляцелі да Ізраіля. У Ізраіле тэрарыстаў затрымалі і выдалі іх СССР, дзе іх судзілі.

2 снежня ў ЗША наступіў 27 старт (STS-27) па праграме Спейс Шатл і 3 палёт у космас шатла Атлантыс з касманаўтамі Робертам Гібсанам, Гаем Гарднерам, Рычардам Малэйнам, Джэрым Росам і Уільямам Шэпердам.

6 снежня прайшоў у Польшчы ўсеагульны перапіс.

7 снежня ад землятрусу ў Армянскай ССР згінула 25 тысяч людзей, 15000 было параненых і 400 000 страціла прытулак. Землятрус знішчыў гарады: Ленінакан, Спітак і Кіравакан.

7 снежня ў Эстонскай ССР аб'явілі, што эстонская мова з'яўляецца афіцыйнай.

9 снежня на станцыі Клемпхен у Лондане ў Англіі ў чыгуначнай катастрофе згінула 35 людзей, а 500 было параненых. Сутыкнуліся там тры цягнікі.

11 снежня ў Ленінакане ў Армянскай ССР разбіўся пры пасадцы савецкі ваенны самалёт Іл-76, які вёз дапамогу для ахвяр землятрусу. Згінула 78 асоб.

21 снежня наступіў выбух у самалёце Боінг-747 амерыканскай кампаніі Пан Амерыкэн над Локербі ў Англіі. Згінула 270 людзей. Віну за выбух у 2003 г. узяла на сябе Лівія. Яе агенты падлажылі бомбу ў самалёце.

У маі 1989 г. мая дачка Ірэна атрымала візу ў ЗША і паляцела ў Чыкага, дзе працавала ў польскім магазіне „Чэрвонэ Яблушка" да красавіка 1991 г. Я працаваў у „Энергапраекце" і акрамя вылетаў з замежнымі экскурсіямі, як гід „Орбіса", з польскімі турыстамі ў Ташкент, Днепрапятроўск і Гомель, у чэрвені выехаў з жонкаю Нінай і ўнукамі Лукой і Грыгорыем на два тыдні ў дом адпачынку „Энергапраекта" ў Сьвінавусці. Мой сын Георгій з дачкой маёй сястры Галінай і зяцем другой дачкі маёй сястры Алегам паехалі ў ліпені на два тыдні машынай Алега ва Францыю ў Манпелье ля Міжземнага Мора на запрашэнне праўнука расійскага царскага контр-адмірала А.А.Конанава – Георгія Ершова. Там правялі прыемна час і вяртаючыся заехалі да ўнучкі маёй цешчы Софіі, якая выйшла замуж за француза і пабачылі яе дзвюх дачок. У кастрычніку зяць, муж Ірэны, таксама атрымаў амерыканскую візу і паляцеў да жонкі ў Чыкага, і працаваў там як інжынер, на фабрыцы. Унукамі апекавалася тады мая жонка, якая пайшла на пенсію, бо мела стаж працы 30 гадоў. Старэйшы ўнук Лука пачаў хадзіць ужо ў школу і жонка мая мусіла ранкам завесці яго ў школу, а пасля прывесці яго са школы дамоў. І хоць школа стаяла недалёка ад іх дома, ёй было цяжка. І таму жонка мая пачала мяне прасіць, каб я таксама пайшоў на пенсію і прыехаў у Беласток. Я, як франтавік, меў права пайсці на пенсію ў 60 гадоў. Таму я ад 1 лістапада 1989 г. стаў пенсіянерам і пераехаў на два гады ў Беласток апекавацца ўнукамі. Мой сын таксама 1 лістапада 1989 г. атрымаў амерыканскую візу і паляцеў у Чыкага і працаваў там на фабрыцы пры камп'ютары да 1997 г. Тады долар меў 20 раз большую вартасць, як сёння. Дзякуючы заробленым доларам дачкі і зяця, яны пабудавалі ў Беластоку дом (8 пакояў, кухня, саўна, два ванныя пакоі, гараж, гаспадарчы пакой) і прадаўшы сваю кааператыўную кватэру яны маглі стварыць прыватную фірму „Трансбуд", збудаваць там для яе будынак, купіць для фірмы розныя патрэбныя машыны. Купілі дзве дачы ля Аўгустоўскага возера.

Калі я жыў у Беластоку, пісаў вершы, успаміны і іншыя артыкулы ў „Ніву"і іх там друкавалі. Выйшаў тады мой першы зборнік вершаў „Эцюды падарожжа", які доўга чакаў друку. Мой другі зборнік вершаў „Маё Падляшша"пачаў тады друкавацца і закончылі яго друк, калі я вярнуўся ў Варшаву.

Я з жонкаю толькі ў сакавіку 1991 г. пераехалі з Беластока ў Варшаву, як вярнулася дачка Ірэна з Чыкага. З Беластока ў летнія месяцы, калі ўнукі не хадзілі ў школу, ездзілі мы аддзельна на запрашэнне да знаёмых у Даўгапіліс, Рыгу і Ленінград. Пасля прыезду дачкі і зяця ездзілі мы ў Данію ў Капенхаген і з унукамі ў Закапанэ, у Палангу, у Вільнюс, у Марскую Крыніцу ў Польшчы, у Гайдэ Парк у Заходняй Нямеччыне, у Славакію і іншыя месцы. Пасля ўнукі самі ездзілі ў Турцыю, Грэцыю, Егіпет, бачылі егіпецкія піраміды. А сын і дачка адпачывалі над морам у Іспаніі.

Калі я жыў у Беластоку, не меў часу, каб ездзіць гідам на замежныя экскурсіі і працу ў „Орбісе"закончыў. За мяжу ездзіў толькі прыватна. Пасля 1991 г., калі вярнуўся з жонкаю ў Варшаву, то на просьбу „Энергапраекта" зрабіў я дома 7 розных праектаў у электрастанцыях, за якія мне плацілі. Больш не захацеў праектаваць, бо пенсію я з жонкаю атрымалі добрую і я не патрабаваў дадатковага заробку. Цяпер нікуды далёка не выязджаем.

Цяпер сын мой працуе ў Варшаўскім універсітэце, мае ўласны дом з гаражом, больш як 200 кв.м.

І кожны ўнук таксама мае свой дом па 160 кв. м. і добрую працу. Адзін унук ёсць магістрам інжынерам і кіруе фірмай „Трансбуд", яго жонка працуе суддзёй. Другі ўнук закончыў юрыдычны факультэт і з'яўляецца віцэ-кіраўніком фірмы, а яго жонка працуе адвакатам, мае сваю ўласную адвакацкую канцылярыю ў Беластоку. Адзін сын жонкі майго сына быў на кантракце ў Навай Зеландыі і залажыў там сваю фірму, і не хоча вярнуцца ў Польшчу. Другі з'яўляецца магістрам інжынерам і працуе ў Варшаве.

Дзмітры Шатыловіч

(Працяг будзе)

Męczennik w sutannie z Białowieży

W tym roku mijają dwie okrągłe rocznice związane z osobą o. Konstantego Bajko z Białowieży – 105. rocznica Jego urodzin i 30. rocznica śmierci. Konstanty Bajko był prawosławnym duchownym, nauczycielem, lekarzem, więźniem politycznym, męczennikiem. Godnie reprezentował swoją rodzinną miejscowość.

Konstanty Bajko urodził się 19 marca 1909 roku w Białowieży, w białoruskiej chłopskiej rodzinie Potapa i Marii (z domu Sikorskiej). Dom rodzinny Bajków znajdował się na Zastawie (część Białowieży). Konstanty nie był jedynym dzieckiem w rodzinie, miał jeszcze braci Juliana i Justyna oraz siostry Domnę i Anastazję.

W 1915 roku cała rodzina Bajków, wraz z innymi rodzinami z tych terenów, zmuszona została do ewakuacji w głąb Rosji. Trafiła do Nahajska. Do Białowieży wróciła dopiero po siedmiu latach.

O swoim bracie Julian Bajko wspominał: „Konstanty był chłopcem wybitnie zdolnym i jednocześnie pracowitym. Pamiętam, jak chodził do szkoły w Białowieży. Oświetleniem w domu było płonące na kominku łuczywo. On przy tym kominku czytał. Gdy było już po północy, ojciec, przebudzony, krzyczał: – Kładź się spać! Przez ciebie i my się nie wyśpimy. A przecież wiesz, że rano trzeba nam jechać do wywózki. Biedny Kostia gasił łuczywo i szedł spać. Gdy noce były księżycowe, siadał przy oknie i czytał. Potem szedł do szkoły. Ojciec nie skąpił pieniędzy na naukę syna".

W 1927 roku Konstanty rozpoczął naukę w Państwowym Seminarium Duchownym w Wilnie. Ukończył ją w 1932 roku. Jego brat Julian twierdził, że Kostek pobierał w Wilnie także nauki medyczne.

Po złożeniu egzaminu dojrzałości, Konstanty kontynuował naukę w Studium Teologii Prawosławnej Uniwersytetu Warszawskiego. Mieszkał w internacie, utworzonym przy cerkwi św. Marii Magdaleny. Za dobrą naukę otrzymał nagrodę rektorską – srebrny szwajcarski zegarek firmy Longines. W trakcie studiów służył studentom poradami medycznymi.



O. Konstanty Bajko (1909-1984)

Swoją przyszłą żonę, Łarysę Fiedotjewą, Konstanty poznał w Wołominie. Studenci często jeździli do tamtejszej cerkwi Świętych Piotra i Pawła, by w niej śpiewać. Łarysa była córką dyrektora rosyjskiej szkoły w Łodzi. Jej starsza siostra, Luba, miała zaawansowaną gruźlicę, rodzice wyjechali z nią do Rakowa, pod polsko-radziecką granicę. Młodszą, Łarysę, wyprawili do rodziny, do Wołomina, chcieli ustrzec ją w ten sposób przed chorobą. Luba wkrótce zmarła, lecz jej rodzice nie zdecydowali się na powrót do Łodzi.

4 lutego 1934 roku młodzi wzięli ślub w internackiej cerkwi. Na diakona Konstanty wyświęcony został 18 marca 1934 roku, natomiast święcenia kapłańskie otrzymał 1 kwietnia 1934 roku, z rąk metropolity Dionizego. Już 5 kwietnia został delegowany do parafii w Świerżach (pow. Chełm Lubelski). Był tam proboszczem i jednocześnie kontynuował naukę na uniwersytecie. W 1934 roku został nagrodzony nabiedrennikiem i skufią. W dniu 2 lipca 1935 roku o. Konstantego delegowano do wsi Zbereże (pow. Włodawa). Studia ukończył w 1936 roku.

W 1936 roku w Rakowie, gdzie przebywała żona księdza Konstantego, urodziło się ich pierwsze dziecko – córka Zoja.

W czerwcu 1937 roku o. Konstanty został przeniesiony do diecezji grodzieńskiej i czasowo delegowany do Porozowa (pow. Wołkowysk), dla pełnienia obowiązków proboszcza i dziekana dziekanatu podorskiego. W dniu 8 lipca 1937 roku został czasowo delegowany do pomocy choremu proboszczowi, o. mitratowi Grzegorzowi Łukaszewiczowi, w miejscowości Kleck k. Nieśwież a (woj. nowogródzkie), dla organizowania odbudowy spalonej podczas pożaru cerkwi Zmartwychwstania. W dniu 22 lutego 1938 roku był delegowany w charakterze tymczasowego administratora parafii we wsi Luszniewo (pow. Baranowicze). W dniu 19 kwietnia 1938 roku został przeniesiony z powrotem do Klecka na stanowisko wikariusza parafii Woskresienskiej (Zmartwychwstania). Nominację na proboszcza tejże parafii otrzymał 27 lutego 1941 roku.

Sowieci, po zajęciu tych terenów, chcieli świątynię rozebrać, a na parafię nałożyli kontrybucję. Nękali o.

Konstantego, wkrótce go aresztowali. W więzieniu w Nieświeżu o. Konstanty przebywał od 19 listopada do 4 grudnia 1940 roku jako zakładnik, do czasu wpłacenia przez parafię reszty nałożonej na nią kontrybucji. Był w tym czasie torturowany – wieszano go na krzyżu, podpalano mu pięty, kazano dwie-trzy doby stać na baczność. Gdy się poruszył, w ciało wbijały się ostrza bagnetów. W końcu wypuścili do domu. Wybuchła wojna niemiecko-radziecka. Walki zniszczyły kopuły cerkwi. Niemcy pozwolili cerkiew odbudować.

W 1941 roku władze cerkiewne nagrodziły o. Konstantego kamiławką. W 1942 roku urodził się jego drugi syn – Mateusz.

W końcu 1943 roku o. Konstantego mianowano proboszczem parafii w miasteczku Lachowicze (pow. Baranowicze). Stanowiska tego o. Konstanty jednak nie objął, nie mając możliwości przeniesienia się do Lachowicz z przyczyny wzmożonych działań wojennych. W maju 1944 roku został ewakuowany wraz z rodziną na Białostocczyznę i zamieszkał u rodziców w Białowieży.

W lipcu 1944 roku przeniósł się do Bielska Podlaskiego. Rozpoczął posługę w cerkwi Preczystienskiej, pomagając o. Łuce Plutowiczowi w odradzaniu życia parafialnego i odbudowywaniu zniszczonej świątyni. W sierpniu 1944 roku został mianowany etatowym prefektem w gimnazjum białoruskim i szkole podstawowej. Mieszkał wraz z rodziną na plebani, mieli tam pokój z kuchnią. Córka Zoja rozpoczęła naukę w gimnazjum białoruskim.

W 1945 roku władze cerkiewne przyznały o. Konstantemu napierstny złoty krzyż.

Był to czas niespokojny, nieustabilizowany. Podczas wojny Białostocczyzna kilkakrotnie zmieniała przynależność jurysdykcyjną. Niektóre parafie opowiadały się za zwierzchnictwem arcybiskupa mińskiego i białoruskiego Bazylego, a więc i Moskiewskiego Patriarchatu, inne – władyki Tymoteusza i Polskiego Autokefalicznego Kościoła Prawosławnego. Chaos i dezorientacja były powszechne. Przybyły w początku 1945 roku do Bielska o. Mikołaj Wincukiewicz zaczął próby podporządkowywania cerkwi na Białostocczyźnie Patriarchatowi Moskiewskiemu. W spór włączyły się władze państwowe i odpowiednie służby. W dniu 19 lutego 1946 roku starosta powiatowy, chcąc ostatecznie uregulować sytuację kanoniczno-prawną białostockich cerkwi, zwołał zjazd duchowieństwa bielskiego, na którym jego uczestnicy (25 duchownych) podpisali postanowienie o podporządkowaniu się władzy hierarchii Cerkwi w Polsce. Na tym postanowieniu swój podpis złożył również o. Konstanty Bajko.

Już następnego dnia spotkał się z atakiem ze strony grupki kobiet. Znieważyły one publicznie duchownego, oskarżając o sprzedanie swojej wiary. O. Konstanty to zdarzenie przeżył głęboko, lecz wykonywania swych obowiązków nie porzucił. Podczas wygłaszanych przez siebie kazań często wskazywał na zło ukryte w idei komunistycznej.

Reakcja ze strony specjalnych służb rosyjskich i polskich nastąpiła szybko. Ksiądz stał się człowiekiem niewygodnym dla nowej władzy. Wszechstronnie wykształcony, cieszący się autorytetem wśród parafian, mający duży wpływ na dzieci, stanowił dla niej realne zagrożenie. To zadecydowało, że 15 marca 1946 roku został przez wspomniane służby porwany wprost z ulicy, gdy śpieszył na lekcję religii do liceum im. T. Kościuszki. Siłą go wepchnięto do czarnej taksówki, której szofer miał na sobie sowiecki mundur. Po krótkim przetrzymywaniu w Bielsku Podlaskim został przewieziony do Brześcia, a stąd do Mińska. Rodzinę o. Konstantego przeniesiono wkrótce do zrujnowanego domu. Pierwszą wiadomość o aresztowanym ojcu rodzina otrzymała dopiero po trzech latach.

O. Konstantego, po odmowie uznania zwierzchności arcybiskupa Bazylego, osadzono w mińskim więzieniu. Kilka miesięcy spędził w pojedynczej celi, przykuty łańcuchami do podłogi. Później przyszło fikcyjne oskarżenie, sąd i wyrok. Wojskowy Trybunał Wojsk NKWD Białoruskiego Okręgu Wojskowego zasądził go w dniu 28 listopada 1946 roku na 15 lat łagrów za kołem podbiegunowym i utratę praw obywatelskich na 5 lat. Wyrok był faktycznie skazaniem na śmierć. Z Workuty, gdzie o. Konstantego wysłano, mało kto wracał. On jednak przetrwał. Pracował w 7. kopalni Workuckiego Kombinatu Węglowego, wykładając łacinę na jedenastomiesięcznym kursie dla podwyższenia kwalifikacji felczerów. Przestudiował wówczas wszystkie obowiązujące dyscypliny medyczne i w 1948 roku złożył egzamin felczerski przed państwową komisją egzaminacyjną. Otrzymał pracę jako felczer chirurgiczny w chirurgii urazowej w obozach dla internowanych. Po trzech czy czterech latach o. Konstanty przeszedł zawał serca. Oprócz leczenia, zajmował się potajemnie także duszpasterstwem. Obliczył, że przez łagier przeszło 60 tys. ludzi, z których przeżyło ok. 400.

